Генезіс фальклору не адмяняе міфалогіі. Больш за тое, яна «застаецца яго крыніцай і «будаўнічым матэрыялам», хоць і страчвае значную частку сваіх светапоглядных і нарматыўных функцый, паступова рэдуцыруецца ў спецыфічна эстэтычныя формы культуры» [5, с. 56]. Гэта глыбокая архаічнасць культурных перажыванняў з'яўляецца сутнаснай і адметнай рысай беларускага фальклору.

Яшчэ адна з асноў гуманізму беларускай культуры – сінтэз хрысціянскай духоўнасці і старадаўняй мастацкай міфалогіі. Прычыны гэтай трываласці і жыццёвасці язычніцкіх традыцый у Беларусі ў тым, што далучэнне народа да новай рэлігіі адбывалася з асаблівасцямі: пераважна мірным шляхам і расцягнулася ў часе, бадай што, на два стагоддзі. Мела значэнне і сама «танальнасць» хрышчэння продкаў беларусаў, у адрозненне ад прымусовага, так бы мовіць, «рэвалюцыйнага» хрышчэння Кіеўскага княства.

З прыняццем хрысціянства адбывалася «мірная канвергенцыя» дзвюх ментальнасцей – самабытнай народнай, язычніцкай і хрысціянскай, прыўнесенай з эліністычнай Візантыі [5, с. 52].

Гэты сінтэз знайшоў адлюстраванне ў народнай культуры, дэманструецца ў фіксацыі беларускага фальклору ў XIX ст. Хрысціянская духоўнасць, якая сцвярджае любоў да бліжняга праз любоў да Бога ўзвышае чалавека духоўна, яго чалавечыя якасці, мірыцца з прыроднай сутнасцю чалавека. У сваім даследаванні З. Мажэйка адзначае: «Будучи древнейшими песнями языческих празднеств наступления "великих солнечных дней", волочебные песни с распространением христианства были приспособлены церковниками к первому дню пасхи, которая в Беларуси также называется "великдень". Историческая жизнь обходных волочебных песен аналогична, таким образом, языческим колядкам (тоже приспособленным церковниками к рождеству), с которыми эти песни близко родственны по назначению (обходы дворов), содержанию (празднично-поздравительному) и структурно-стилевым признакам» [7, с. 26–27]. Яшчэ адзін прыклад, звязаны з юр'еўскім і троіцкім (з зававяршаючай «русальнай нядзеляй») святамі: «Внешне приспособленные к более поздним христианским святцам, они развертывают по существу связанные с анимистическим культом растений элементы древней дохристианской обрядности, обусловленные "мирослышанием" живущего в гармонии с природой традиционалистского общества» [7, с. 27].

Значным перыядам ў развіцці беларускай культуры з'яўляецца ⅔ XIX–пач. XX стст. – перыяд станаўлення беларускай нацыянальнай культуры, калі сінтэз хрысціянскай духоўнасці і старадаўняй мастацкай міфалогіі, фальклорнай традыцыі стаў фундаментам яе адраджэння (XIX ст. – перадкласічны перыяд развіцця беларускай культуры, найперш літаратуры, як народнай). Пагодзімся з У. Гніламедавым: «Гэта сапраўдны цуд, што не знікла Беларусь – як народ, як краіна… Гэты цуд у многім забяспечыла – …беларуская літаратура, якая адыграла ролю носьбіта нацыянальнага генетычнага кода, нацыянальнай генетычнай памяці. Яна, як правіла, выступала носьбітам такіх універсальных гуманістычных паняццяў, як сумленне, праўда, справядлівасць, высакароднасць, годнасць» [1, с. 131].

Так, гуманістычная традыцыя найперш прасочваецца ў беларускай літаратуры. Аснову беларускай літаратуры ⅔ XIX–пач. XX стст. склалі ідэі, якія садзейнічалі служэнню народу. У гэтым бачылі сэнс свайго жыцця лепшыя прадстаўнікі новай беларускай літаратуры. Яны ішлі па шляху маральнага пошуку, паказаўшы чалавека, які з'яўляецца захавальнікам народнай маральнасці, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей.

Безумоўна, у беларускай літаратуры склаліся высокія гуманістычныя традыцыі: любоў да чалавека, павага да вынікаў яго працы, адлюстраванне яго імкненняў да сацыяльнай справядлівасці і свабоды, «літаратура аб'ядноўвала народ на глебе духоўнай блізкасці, высокіх маральна-сацыяльных каштоўнасцей і запатрабаванняў» [1, с. 131].

Гуманізм мастацкай культуры Беларусі пач. XX ст., у прыватнасці літаратуры, працягваючы традыцыі XIX ст., набывае новы характар. Ён з'яўляецца перыядам класічнага народнага гуманізму, які знайшоў больш яркае адлюстраванне ў творах Я. Коласа і Я. Купалы і інш. Класічны перыяд вельмі важкі, так як з'яўляецца ўзорам для разумення гуманістычных народных каранёў. Гуманістычны змест гэтага перыяду становіцца асновай для ўсёй беларускай культуры.

Зварот да гуманістычных традыцый мінулага Беларусі працягваецца і сёння. Гэта дае магчымасць раскрыць іх значэнне для развіцця сучаснай культуры ў духу гуманізму і агульначалавечых каштоўнасцей. Раскрыццё гуманістычных тэндэнцый у культуры Беларусі садзейнічае ўзбагачэнню, напаўняльнасці нацыянальнай культуры.

**Спіс літаратуры:**

1. Гніламёдаў, У. Літаратура. Гісторыя. Свядомасць : гісторыка-літаратурны нарыс / Уладзімір Гніламедаў, Мікола Мікуліч. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 387 с.
2. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча / уклад. М. Козенка ; навук. рэд. В. Калацэй. – Мінск : выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2011. – С. 10–79.
3. Конан, Ул. Ля вытокаў самапазнання : Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / Уладзімір Конан. – Мінск : Маст. Літ., 1989. – 238 с.
4. Конан, Ул. Беларускае нацыянальнае Адраджэнне : гісторыка-тыпалагічны аналіз паняцця / Уладзімір Конан // Беларусіка – Albaruthenica I. – Мінск, 1993.
5. Конан, Ул. Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі / Ул. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 4. – С. 47–57.
6. Конан, Ул. Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі / Уладзімір Конан : У 3 т. ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Т. 1. : X ст.−1905 г. − 439 с.
7. Можейко, З. Экология традиционной народно-музыкальной культуры : нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем / Зинаида Можейко. – Минск : Беларус. навука, 2011. – 147 с.

***Паліна Кургановіч***

## ЭНГЕЛЬС ДАРАШЭВІЧ : «ФАЛЬКЛОР ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ»

*У артыкуле колішняя вучаніца прафесара Э. Дарашэвіча, пазней – загадчык аддзела музея-ска́нсэна і магістрант НАН Беларусі – робіць спробу асэнсавання складовых разумення фальклору прафесарам Дарашэвічам, а таксама аналізуе метады перадачы гэтага разумення яго студэнтам на дысцыплінах «Тэорыя фальклору» і «Культурная антрапалогія».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Palina Kuranovich***

**ENGELS DARASHEVICH : «FOLKLORE IS LIFE»**

*In this article, the former student of Professor E. Darashevich, later – the head of the museum-scansen department and undergraduate of the National Academy of Sciences of Belarus – comprehends the components of understanding of folklore by E. Darashevich, as well as the methods of transmitting this understanding to his students at the lectures «Theory of Folklore» and «Cultural Anthropology».*

Знаёмства з прафесарам Энгельсам Дарашэвічам адбылося, калі я стала студэнткай універсітэта культуры і мастацтваў. Ён выкладаў дысцыпліну «Тэорыя фальклору», якая пачалася на нашым курсе адразу – з 2010 г. Першая думка пасля знаёмства з гэтым геніяльным чалавекам была наступная: «Wow! Тут будзе цікава!» Выкладаць Энгельс Канстанцінавіч сапраўды любіў, хоць і палохаў нас, сціплых студэнтаў першага курса, што будзе складана. «Складана», аднак, не было, а было вельмі нестандартна і прадуктыўна. Кожны наш занятак быў настолькі насычаным і цікавым інфармацыйна, што мы не заўважалі, як хутка ляціць час, а таксама, што лекцыя – скончана. За акадэмічную па́ру мы паспявалі абмеркаваць змест заяўленай тэмы лекцыі, а таксама – амаль усё, што дзеецца ў свеце ў галіне культуры паа́бапал тэмы. Прычым ад нас патрабавалася выхаваць у сабе жаданне ўдзельнічаць у дыскусіях, уменне аналізаваць, не баяцца выказваць свае думкі і меркаванні. У дыялогу прафесар быў з намі на «роўным узроўні». Ніколі не забуду, як сп. Энгельс, паспрачаўшыся з намі і прайграўшы спрэчку, на наступную лекцыю прынёс запечанага карпа, згатаванага па сваім уласным рэцэпце. Было вельмі забаўна, мы нават не спадзяваліся на такое завяршэнне спрэчкі. А яна плаўна перарасла ў знаёмства з «Літоўскай гаспадыняй» (своеасаблівай «альфай ды амегай» беларускай этнічнай кулінарыі і дамаводства) [4]. Потым пачалося абмеркаванне асобы аўтаркі гэтага выдання – мінскай шляхцянкі і дабрачынніцы Ганны Цюндзявіцкай, якая выдаўшала сваю кнігу ў 1848 г. А потым паразмаўлялі пра эдытара і каментатара перавыдання яе на мяжы XX–XXI ст. (мал. 1) – даўняга знаёмага нашага прафесара – сп. Адама Мальдзіса. Тлумачэнне А. Мальдзіса, чаму «Gospodyni litewska czyli Nauka utrzymywania porządnie domu tudzież hodowania i utrzymywania bydła» прысвечана кухні і побыту пераважна Цэнтральнай Беларусі XIX ст., а таксама грунтоўны каментар да акалічнасцей лёсу дадзенага выдання Э. Дарашэвіча ліквідавалі шэраг «прабелаў» у нашых ведах пра мінулае нашай Радзімы, майго роднага Мінску і яго колішніх жыхароў.



Малюнак 1 – Перавыданне «Gospodyni litewska…» Мінск, 2012





Малюнак 2 – Інтэрактыўныя танцы і адпачынак на арт-фэсце «Тэатр Уршулі Радзівіл у Несвіжскім замку». Грае – фальклорны гурт кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ «Раме» (курс В. Калацэя), танчаць і адпачываюць – гурт «Страла» (курс Э. Шчадрынай). Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, 2012



Малюнак 3 – Выпускніца К. Асадчая і Э. Дарашэвіч. Вільнюс, 2017

Мы сустракаліся з Э. Дарашэвічам вельмі часта на розных пазааўдыторных («жыццёвых») мерапрыемствах: на канцэртах, выставах, у падарожжах. Сп. Энгельс вельмі любіў вандраваць, нягледзячы на яго паважаны ўзрост, а таксама даводзіў нам, што мабільнасць – адна з асноўных рыс даследчыка-антраполага і даследчыка-фалькларыста, першая палова працы якіх – «у полі», ці як яшчэ кажуць «на зямлі» (гэта – абазначэнне экспедыцыйнай работы на своеасаблівым антрапалагічна-фалькларыстычным «слэнгу»), а ўжо другая палова – за камп'ютэрам і ў рэпетыцыйнай аўдыторыі. Падчас вандровак можна было пачуць і цікавую гісторыю з яго жыцця, і важную інфармацыю па любой дысцыпліне: ад філасофіі да фізікі ды генетыкі, а таксама – выкананне розных оперных арый і народных песень. Адна з яго непахісных пазіцый – фальклор не трэба «выкрэсліваць» са страндартнай паводзіннай культуры народа, рабіць «выключным, але іншародным целам» у жыцці людзей, якія навокал. Ён – «кроў ад крыві і плоць ад плоці» агульнай мазаікі культуры Беларусі, выдатна спалучаецца і з вясковай сядзібай, і з гістарычнымі шляхетнымі інтэр'ерамі, ды з джынсамі і кедамі; а мы, як даследчыкі і пераемнікі народнай творчасці, павінны несці яго паўсюль разам з сабой. Несці арганічна, не саромецца і не будаваць бар'ераў паміж сваім мастацтвам і людзьмі, якім яно, фактычна, накіравана. Магчыма, м е т о д ы к а выкладання, у якой спалучаліся a) *абмеркаванне* (дыялог), b) *дэманстрацыя* (ўзораў і форм падачы фальклору), c) правакаванне *самастойнай работы* студэнтаў, узмоцненая эрудыцыяй і досведам выкладчыка, і з'яўляліся «фірмовым стылем» прафесара Э.Дарашэвіча.

Набыты пры зносінах з ім светапогляд потым нам неаднойчы дапамагаў, калі мы ўдзельнічалі ў народных святах у музеі-ска́нсэне пад Мінскам, арт-фэсце «Тэатр Уршулі Радзівіл у Несвіжскім замку» (мал. 2), інтэрактыўных імпрэзах у Беларусі, Латвіі, Эстоніі, Польшчы і Летуве. Апошнюю Э. Дарашэвіч не толькі вельмі добра ведаў (бо ў свой час шмат працаваў у Бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта), а таксама шчыра любіў (мал. 3). Дарэчы, яго лекцыі адносна трох этапаў старажытнай гісторыі Беларусі (даіндаеўрапейскага, балтыйскага і славянскага), паводле гісторыка і археолага, даследчыка старажытнага Мінска Эдуарда Загарульскага [2], якога сп. Энгельс таксама добра ведаў асабіста, «непахісна» сістэмна аформілі разуменне этнагенезу нашага народа ўсімі студэнтамі курса.

Прафесар Энгельс Дарашэвіч – А с о б а з вялікай літары. Яго любоў да традыцыйнай культуры, да навукі, а таксама энергічная неабыякавасць да іх стану была бачная ва ўсім. І гэтая энергія перадавался кожнаму, з кім ён размаўляў, перапісваўся, здзяйсняў навуковыя праекты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на складаны лёс (прайсці II Сусветную жывымі, на жаль, выпала далёка не ўсім яго родным, сваякам і сябрам), ён ніколі не спыняўся на дасягнутым. На сваім прыкладзе ён паказваў, як трэба любіць жыццё, тое, чым ты прафесійна займаешся, шанаваць сваю культуру. Парады Э. Дарашэвіча заўсёды былі вельмі трапныя і дакладныя, яны дапамагалі вырашаць любое пытанне. Маючы надзвычай вялікі жыццёвы досвед, сп. Энгельс мог сказаць зухаватае слаўцо, даць добрую параду, заўсёды падтрымліваў студэнтаў падчас навучання, шукаў зацікаўленых абітурыентаў для кафедры і «валанцёраў» сярод нас для магістратуры і аспірантуры – паслядоўна ствараў на кафедры навуковую школу, арыентаваную на культурную антрапалогію з ухілам (улічваючы спецыфіку БДУКМ) на практычную фалькларыстыку.

Прафесар заўсёды заахвочваў нас, студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору, каб мы ездзілі ў экспедыцыі, вандроўкі па сваёй зямлі, запісвалі, фіксавалі, а таксама ўдзельнічалі ў абрадах, традыцыйных святах, фестывалях. Імаверна, такая апантанасць нам і перадалася, што перарасло ў падарожжы на возера Свіцязь у мясцовы санаторый, якія ў 2012–2014 гг. паўтараліся кожны год узімку і летам. Я тады была ў складзе гурта «Страла» пад кіраўніцтвам магістра мастацтваў ст. выкладчыка Э. Шчадрыной. Нейкім чынам Э. Дарашэвіч дамовіўся з кіраўніцтвам санаторыя пра тое, каб студэнты кафедры этналогіі і фальклору змаглі правесці два разы на год сезонны традыцыйны абрад (Масленку і Купалле) з народнымі беларускімі песнямі і танцамі [3]. Сп. Энгельс натхніў студэнтаў – некалькі курсаў самаарганізаваліся, а лідэрам першага Купалля на Свіцязі стала тагачасная студэнтка 4-га, перадвыпускнога, курса К. Блоцкая (мал. 4). Нас, студэнтаў у купальскай ці масленічнай грамадзе, прымалі і сустракалі вельмі добра: адпачываючым у санаторыі было надзвычай цікава пачуць аўтэнтычныя песні ў нашым выкананні, прайсці ў святочным шэсці (мал. 5) паглыбіцца ў гукавыя хвалі дуды, скрыпкі і дыятанічных цымбалаў (мал. 6), таму пасля свята мы заўжды атрымлівалі шмат падзяк ад людзей, якія былі ўражаны прыгажосцю беларускай песні, таемнасцю і глыбінёй традыцыйных абрадаў. Было прыемна бачыць, што народная культура можа натхняць людзей, далёкіх ад гэтага ў сваім паўсядзённым жыцці, даваць і пакідаць пазітыўныя эмоцыі, прыцягваць да традыцый увагу моладзі (мал. 7).


Малюнак 4 –К. Блоцкая. Купалле на Свіцязі, 2012


Малюнак 5 – Купальскае шэсце разам з адпачываючымі ў санаторыі. Свіцязь, 2012


Малюнак 6 – Дудары М. Халькоў, М. Дашыневіч, 2012


Малюнак 7 – Удзельніцы Купалля з санаторыя. Свіцязь, 2012

Я спадзяюся, Энгельс Канстанцінавіч шчыра ганарыўся намі, асабліва тым, што мы – студэнты кафедры этналогіі і фальклору (якім ён на лекцыях па тэарэтычных дысцыплінах старанна тлумачыў, як змагаліся за лёс народаў, культуру якіх вывучалі, выбітныя еўрапейскія і амерыканскія антраполагі) – пасля заканчэння навучання ва ўніверсітэце, атрымання дыпломаў спецыяліста па фальклоры і далей працягваем займацца народнай творчасцю, перадаём павагу і любоў да беларускай песні, традыцыйнай культуры іншым людзям. Ён вучыў не прымаць памылковы стэрэатып, што праца фалькларыста – апісаць і здаць у архіў, а перад усім спрыяць пераймannю і жыццю таго, што фалькларыст вывучае.

«Даследчыкі амаль адзінагалосна сцвярджаюць, што фальклор – праграмная аснова ўсёй гуманістычна зарыентаванай сусветнай мастацкай культуры, крыніца асобных нацыянальных мастацкіх традыцый, увасабленне самасвядомасці народаў» (1, с. 6), – так пісаў і сцвярджаў Э. Дарашэвіч. Таксама «на гэтай хвалі», – што «фальклор ёсць жыццё» – ён рыхтаваў сваіх студэнтаў да самастойнага шляху праз хітраспляценні жыцця з рознымі аспектамі традыцыі, ад яго неадлучных. Пасля знаёмства з прафесарам мы былі здольныя гэту неадлучнасць пастаянна заўважаць і ўсведамляць: у няспыннай змене сезонаў, заканамернасцях сямейнага і грамадскага побыту, напрамках і сэнсах адаптацыйных памкненняў нашых сучаснікаў. Разуменне і любоў да традыцыйнай культуры (убудаванай у мастацтва, свядомасць, жыццё такіх розных, і, адначасова, падобных сваёй людскасцю народаў) перадалася і нам, яго выпускнікам, за што мы абавязаны сказаць: «Шчыры-шчыры дзякуй, спадар Энгельс!»

**Спіс літаратуры:**


1. Дарашэвіч, Э. Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Энгельс Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с. : іл.
2. Загорульский, Э. Древняя история Белоруссии / Эдуард Загорульский. – Минск : БДУ, 1974. – 136 с. : ил.
3. Купалле на Свіцязі // Этнафанічная талака [Эл-ны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://vk.com/album-34659097_159571851. – Дата доступу : 08.04.2020.
4. Літоўская гаспадыня / уст. А. Мальдзіса. – Мінск : Беларусь, 2012. – 383 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Артемий Щеголютин***

**«БЕСКОНЕЧНАЯ СЛОЖНОСТЬ ЖИЗНИ…» (*памяти профессора Э. Дорошевича*)**

*В статье, посвященной памяти Э. Дорошевича, его студент-фольклорист анализирует влияние стиля и методов преподавания профессора на становление личности исследователя и хранителя искусства устной традиции.*